**Ірына Герасімчык**
*Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы*

# ІНФАРМАЦЫЙНА-НАВІНАВАЕ НАПАЎНЕННЕ РАЁННАЙ ГАЗЕТЫ
## (на прыкладзе друкаваных СМІ Гродзенскай вобласці)

Рэгіянальная прэса займае асаблівае месца ў сістэме друкаваных СМІ. Арыентуючыся на аўдыторыю, сегментаваную выключна паводле тэрыторыі пражывання, мясцовая газета адрозніваецца высокім узроўнем персаніфікаванасці зносін, характарызуецца універсальнасцю тэматыкі. «Часта дазены тып прэсы выступае асноўнай крыніцай інфармацыі ў гарадах і раёнах вобласці, своеасаблівым цэнтрам сацыяльна-культурных сувязей канкрэтнай тэрытарыяльнай супольнасці, сродкам арганізацыі, каардынацыі і рэгулявання мясцовага грамадства» [1, с. 313].

Масіў тэкстаў, функцыянальна накіраваны на інфармаванне насельніцтва пра падзеі, што адбываюцца ў раёне, краіне, свеце, вылучаецца патрабаваннем аператыўнасці і прэзентуецца праз аператыўна-навінавыя і аператыўна-даследчыя жанры журналістыкі. Вывучэнне асаблівасцей фарміравання інфармацыйна-навінавага кантэнту раённай газеты актуальнае і ў плане вызначэння спецыфікі канструявання інфармацыйнай карціны дня ў рэгіёне, і ў плане аналізу падыходаў да распрацоўкі канцэпцыі газеты, а таксама важнае з пазіцыі крытычнага асэнсавання зместу, што запаўняе масмедыйную прастору ў рэгіёне. Аднымі з ключавых характарыстык, што ўказваюць на спецыфіку працэсу інфармавання праз друкаваныя СМІ, выступаюць аўтарскі склад, геаграфія падзей, што адлюстроўваюцца ў выданні, тэматычная і жанрава-стылёвая спецыфіка матэрыялаў.

Аналіз публікацый раённых газет Гродзеншчыны за 2016–2017 гг. паказаў, што аўтарамі інфармацыйных матэрыялаў становяцца не толькі журналісты – удзельнікі рэдакцыйных калектываў, але і прадстаўнікі вонкавых аўдыторый. Аўтары-журналісты ідэнтыфікуюць сябе з прадстаўнікамі тэрытарыяльнай супольнасці, прэзентуюць інфармацыю пераважна лакальнага характару, якая стварае (умацоўвае, аднаўляе) імідж раёна. Заўважную пазіцыю ў фарміраванні кантэнту раённай газеты маюць тэксты, што прэзентуюцца прадстаўнікамі розных устаноў і арганізацый (старшыні Саветаў дэпутатаў, кіраўнікі раённых аб’яднанняў прафсаюзаў, старшыні раённых камітэтаў, прадстаўнікі ДАІ, РАУС, следчага камітэта, статыстычнага ўпраўлення, камітэта дзяржкантролю і пад.). У матэрыялах за подпісам адзначаных аўтараў падаецца інфармацыя пра змены ў заканадаўстве, падпісанне ўказаў

і пастаноў, а таксама крымінальныя звесткі, статыстычныя дадзеныя, справаздачы па выніках праверак і г. д. Адзначаныя публікацыі на газетнай паласе падаюцца ці як перадрук афіцыйных дакументаў органаў улады, ці ў выглядзе звестак ад імя спецыяліста, эксперта ў пэўнай галіне, што ўяўляюць сабой афіцыйна-справавую інфармацыю ў перапрацаванай форме. Аналіз матэрыялаў указвае на станаўленне на старонках раённых газет новай жанравай формы. Спецыфіка публікацый у жанры інфармацыі абумоўлена ўплывам масавых камунікацыйных працэсаў і забяспечваецца нарастальнай жанравай дыферэнцыяцыяй рэгіянальнай газеты: у тэкставай прасторы сумяшчаюцца элементы афіцыйна-справавога маўлення (маўленчыя штампы, клішэ, канцылярызмы) і мастацкія, экспрэсіўныя элементы (інтэртэкстуальныя загалоўкі, прыказкі, эмацыйна афарбаваныя і ацэнкавыя моўныя адзінкі) з мэтай прыцягнення ўвагі да інфармацыйнага матэрыялу, забяспечвання эфекту ўздзеяння. Мае месца сумяшчэнне ў тэксце фрагментаў, што ўказваюць на рэалізацыю розных мэтаў аўтара, дапаўненне функцыі інфармавання ўстаноўкамі на наладжванне кантакту, напамін, папярэджанне, перасцярогу, акцэнтаванне ўвагі, навучанне і пад.

Аўтарамі газетных публікацый выступаюць і прадстаўнікі чытацкай аўдыторыі (студэнты ВНУ і вучні школ, кіраўнікі ўстаноў адукацыі і настаўнікі, бібліятэкары). Абсалютная большасць публікацый адзначаных аўтараў прысвечана пытанням, звязаным са сферамі адукацыі і культуры (правядзенне святаў і конкурсаў, арганізацыя адукацыйных курсаў і культурна-пазнавальных мерапрыемстваў). Тэксты маюць пазітыўна ацэначны характар, утрымліваюць тыя факты, якія садзейнічаюць фарміраванню станоўчага іміджу ўстановы – арганізатара мерапрыемства (адсылкі да сацыяльна-культурных патрэб, зварот да пачуццяў, указанні толькі на перавагі аб’екта), што ўласціва найперш дыскурсу PR.

Персаніфікаванасць зносінаў, што адрознівае раённую газету, садзейнічае таму, што на яе старонках застаецца запатрабаванай такая форма камунікацыі з аўдыторыяй, як апытанне, у папяровых версіях выданняў мае месца перадрук каментараў і водгукаў чытачоў, апублікаваных на сайтах адпаведных СМІ. Раённыя газеты забяспечваюць рэалізацыю прынцыпу інтэрактыўнасці праз уключэнне чытацкай аўдыторыі ў працэс стварэння інфармацыйнага прадукту, а значыць, імкнуцца (з рознай ступенню актыўнасці) рэалізаваць ідэю запатрабаванасці публічнай камунікацыі праз друкаванае выданне.

Інфармацыйныя блокі, падрыхтаваныя з выкарыстаннем матэрыялаў інфармацыйнага агенцтва БелТА, прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і іншых СМІ, прысутныя практычна ў кожнай раённай газеце і

могуць падавацца без змен ці скарачацца, перапрацоўвацца пад патрэбы чытача мясцовага выдання. Усе адзначаныя тэксты прэзентуюць пераважна інфармацыю рэспубліканскай значнасці і закранаюць пытанні, што датычаць кожнага жыхара краіны (захады па барацьбе з карупцыяй, міждзяржаўныя дамовы, змены ў сферы адукацыі і пад.).

Прынцып лакальнасці пры распрацоўцы і рэалізацыі канцэпцыі раённай газеты рэалізуецца праз адбор і апрацоўку толькі той навінавай інфармацыі, якая мае дачыненне да арэалу распаўсюду газеты. Найбольшая колькасць публікацый у раённых СМІ накіравана на асвятленне падзей лакальнага характару, значнасць якіх відавочная для ўсіх жыхароў раёна. Аднак усё больш заўважную ролю ў фарміраванні інфармацыйнай карціны дня ў раённых СМІ выконваюць матэрыялы нерэгіянальнага зместу. Замежныя, рэспубліканскія і абласныя падзеі становяцца інфармацыйнай нагодай для журналістаў раённых СМІ ў сітуацыях, калі:

– звязаны з дзейнасцю ўладных структур (правядзенне прамых тэлефонных ліній, падпісанне распараджэнняў, выязныя паседжанні аблвыканкама, прэс-канферэнцыі і круглыя сталы з удзелам прадстаўнікоў улады). Раённая газета становіцца пляцоўкай для фарміравання іміджу ўлады, праз адбор фактаў выяўляецца найперш пазіцыя заснавальніка газеты. З улікам таго, што раённае выданне выконвае вызначальную ролю ў арганізацыі інфармацыйнай прасторы і мае на мэце адаптаванне рэспубліканскай інфармацыі пад патрэбы канкрэтнага горада і раёна, актуальным бачыцца выбар жанру публікацыі, адыход ад стратэгіі інфармавання да аналітычнага асэнсавання актуальных з'яў у жыцці грамадства;

– актуальныя ў маштабах раёна. Падобныя навіны закранаюць інтарэсы мясцовасці, адрозніваюцца псіхалагічнай блізкасцю атрымальніку інфармацыі. Праз зварот да падзей рэспубліканскага / міжнароднага ўзроўню (удзел ці перамогі прадстаўнікоў тэрытарыяльнай супольнасці ў мерапрыемствах) перыядычнае выданне ў большасці выпадкаў імкнецца паказаць «свайго» чалавека, падкрэсліць значнасць маштабнай падзеі для раёна;

– звязаны з мясцовым кантэкстам апасродкавана. Падзеі, да якіх звяртаюцца раённыя СМІ, могуць быць цікавыя ў супастаўляльным плане, фіксуюць сувязь (падабенства ці адрозненне) у развіцці рэгіёнаў. Падобныя навіны (рэспубліканскія і замежныя) указваюць на магчымыя наступствы для аўдыторыі, утрымліваюць канфлікт ці негатыўны кампанент, цікавыя праз удзел вядомых персон. Адбор фактаў звязаны

з імкненнем рэдакцыі забяспечыць арыгінальнасць канцэпцыі газеты, вытрымаць канкурэнцыю з іншымі сродкамі атрымання інфармацыі (у тым ліку і з інтэрнэт-рэсурсамі), а таксама сведчыць пра зацікаўленні і прыярытэты ўдзельнікаў рэдакцыйнага калектыву.

Такім чынам, на сучасным этапе развіцця рэгіянальнага друку мае месца пашырэнне геаграфіі падзей, якія адлюстроўваюцца на старонках газет, адзначаецца факт нівелявання ідэі прыярытэтнасці фактару раёна пры распрацоўцы канцэпцыі мясцовага выдання, актуалізуецца праблема нераспрацаванасці дакладных крытэрыяў адбору навінавай інфармацыі з мэтай спалучыць рэгіянальны кантэнт і навіны нелакальнага характару.

*Літаратура*

1. Кедяркин, С. Н. Современная районная пресса Нижегородской области / С. Н. Кедяркин, Л. С. Макарова // Вестник Нижегородского университета им. Н. И. Лобачевского. – 2010. – № 4 (1). – С. 313–319.

**Екатерина Гуртовая**
*Белорусский государственный университет*

## АВТОР В СОВРЕМЕННОЙ ФОТОЖУРНАЛИСТИКЕ

Для большинства современных людей фотокамера больше не является отдельным устройством, представляя собой функцию телефона, компьютера или цифрового плеера. Возможность публикации фотоснимков с помощью Facebook или таких специальных приложений, как Instagram, способствует тому, что сегодня производится как никогда большое количество фотографий. Более 250 миллионов снимков загружалось в Facebook еще несколько лет назад, около 40 миллионов в Instagram [2, с. 215]. Разумеется, сегодня количество производимых в мире фотографий возросло. Бурное развитие техники возбуждает интерес к фотографии как к технологии, подчас экзотической, отодвигает на второй план вопрос авторского видения. Очки GoogleGlass, позволяющие вести незаметную фото- и видеосъемку, обозначают новые пути для развития фотографии. Подобные Lytrolightfieldcamera технологии предоставляют возможность изменять фокус после осуществления экспозиции. Такие инновации, как Sony QX, показывают, как может быть преодолен разрыв между смартфонами и фотоаппаратами со съемными объективами. За достаточно короткий срок широкое распространение приобрели фотографии, полученные с помощью дронов. Возникшая на фоне развития цифровых технологий гражданская журналистика в силу